Ніна Лістота

# ЗАПРАШЭННЕ

*Зборнік вершаў*

Мінск
Выдавец А. М. Янушкевіч
2019

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
Л63

**Лістота, Н.**
Л63 Запрашэнне : зборнік вершаў / Ніна Лістота. — Мінск : А. М. Янушкевіч, 2019. — 114 с.
ISBN 978-985-7210-09-1.

«Запрашэнне» — дэбютны паэтычны зборнік Ніны Лістоты. Яе вершы даюць надзею і натхненне кожнаму, у іх адчуваецца юнацкі давер будучыні. Гэтая кніга прапануе сустрэць разам світанне на даху шматпавярховіка — як у аднайменным вершы. Гэта — запрашэнне адчуць той свет, які прыдумала паэтка.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-7210-09-1**

© Лістота Н. С., 2019
© Афармленне.
Выдавец А. М. Янушкевіч, 2019

# ДЗВЕ ДУШЫ

## ДЗВЕ ДУШЫ

Дзве душы вечарамі свечкі палілі,
Елі сочыва з хлебам, гарбату пілі.
І пра тое, пра сёе яны гаварылі.
Дзве душы быццам родныя сёстры былі.

Ён, яна. Два адчыненых сэрцы.
Ці сяброўскіх, ці брацкіх. Яднанне адно.
Залатое святло з абажура ліецца,
На іх кубачкаў падае дно.

— Раскажы, раскажы. Тое, што замаўчаў,
Тое, што ты хаваў, не казаў.
Што баліць, што гарыць, а што трэба забыць.
Мы і боль можам разам дапіць.

Свечкі ціха смяяліся словам у такт,
Мякка пелі хвілінай маўчання.
Слёзы падалі раптам — чакалі працяг.
Так сядзелася доўга, да рання...

Дзве душы вечарамі зноў разам былі,
Елі сочыва з хлебам, гарбату пілі.
— Дзе была? Што знайшла? Ты дадому прыйшла.
— Так. Адна на шляхах быць ніяк не змагла.

Ён. Яна. Два адкрытыя сэрцы.
Ці сяброўскіх, ці брацкіх. Яднанне адно.
Залатое святло з абажура ліецца,
На іх кубачкаў падае дно.

*15 верасня 2018*

* * *

Без крыкаў. Без шуму.
Без роспачы. Без болю.
Без галаваломак
Крыжовага шляху па хлеб.
Без правілаў гульні.
Без няправільных суседзяў.
Без ваганняў. Без спакусы.
Без стрэсу і без прымусу.
Вы
ры
ва
ю
ся
ў жыццё.

*20 верасня 2018*

* * *

Вось і ён, гэты новы дзень,
Стаіць ля дзвярэй,
Коткай п’е малако,
Вушкі склаўшы лацвей.

Новы час залатым святлом
Спавівае свой цень.

Дзень разліцца хацеў
Па ўзбярэжжы маіх крыніц
І слязінкамі шчасця blішчэў
З глыбіні вачніц.

Дзень прагнаў усіх чужаніц,
Стому ціха паклаў ён ніц.

...Мне цябе новы дзень абяцаў,
Сэрца мякка ў далоні уклаў.
Я люблю гэта ўсё. Цяпер
Твой шукаю давер.

*2 студзеня 2018*

## СЦЮЖА

Я іду,
Але я баюся:
А што будзе, калі паслізнуся?
Калі месяц паб'ю крыштальны,
Як жыць будзем у цемры далей?

Футрам тонкім засланыя вокны,
І свет белы скаваны зашчоўкай.
Сэрца птушкай б'ецца ў клетцы.
Хто адчыніць замерзлыя дзверцы?

Хто мне дасць натхнення і волі?
Бо даволі сцюжы. Да болю —
Жыць у шэрым, пустым пастарунку.
А зіма малюе карункі...

Разламаліся крохкія краты,
Пад нагамі лёд — бы гарматы,
Быццам трэск фіялетавай белі,
Быццам новае сцюжа сцеле.

У ціхім ззянні, у цёплым прызнанні
Новы год сустракае ранне.

*20 снежня 2018*

## ЛЮДЗІ-ДЭЛЬФІНЫ

Людзі-льдзіны
І людзі-дэльфіны
Паказваюць хутка
Гладкія спіны.
Людзі-каметы
Ляцяць па свеце,
Маюць іскры,
Ў якія адзеты.
Людзі-трампліны
І людзі-міны
За спінаю
Строяць кпіны.
Ёсць людзі-радасць
І людзі-знаходкі,
Што свет ствараюць
Зіхоткі.
Ёсць людзі-каханне
І людзі-растанне,
То грэе, то студзіць
Іх ззянне.
Ёсць людзі-абломкі
І людзі-глыбы.
Адныя з голасам звонкім,
Другія — паліпы.
...А ў казачным лесе
Няма слядоў на снезе,
Як пройдзе хто чалавечы —
Абдымі за плечы.
Нашы родныя душы
Дзесьці побач рушаць,
Не судзі іх строга,

Хоць і слабасцяў многа.
Людзі з водарам кавы,
Людзі з пахам парфумы,
Адны гатуюць стравы,
Другія думаюць думы.
Людзі, што маюць сакрэты,
Людзі, нікім не сагрэты,
У зімнім казачным лесе
Сляды шукаю на снезе.

*10 снежня 2017*

* * *

Ноч чорная,
як маўклівая панна
ў аксамітнай сукенцы;
згубіла завушніцы-зоры,
пудру рассыпала —
Млечны Шлях.
Месяцам белым упрыгожылася —
радзімка-караблік.
Ноч выткала ўзоры каханняў,
вечаровых спатканняў.
А панна пальчатку доўгую
згубіла на лесвіцы...
Ён знайшоў. Поўнач.
Ні карэты, ні дзяўчыны,
ні ўбору аксамітнага.
Толькі ноч чорная
ведае таямніцу.

*16 кастрычніка 2018*

## ВОСЕНЬ

Восень ціха ў дзверы грукае,
«Тах, тах, тах» — яе сэрца стукае —
Запускае руку ў лета кошык,
Не ўтрымала — пачуўся пошчак.

Павуцінне выткалі лапкамі,
Павукі раптам сталі зграбнымі.
Дываны іх у белай расе
На світанні ва ўсёй красе.

Адспявалі жоравы ў небе,
І няма валошак у хлебе.
Восень свежая, восень чыстая
Першым лісцем заззяла агністым.

Але ты не здавайся, лета,
Дай цяпла свайго колькі свету:
Хай яшчэ пагрэюцца людзі,
Хто там знае, як далей будзе...

*24 жніўня 2018*

* * *

Я дарога,
прысыпаная
пяском і камянямі,
выпрастаная
аднадзённымі тысячагадовымі войнамі.
Я поле,
парослае маладзенькай травой,
якое цягнецца насустрач сонцу,
выцалаванае расой,
заабдыманае матылькамі.
Я вецер,
нястомны ўладар сусвету,
дзе Пан Бог паставіў мяне
вартаваць усе дарогі і скрыжаванні
ад тупікоў.
Я дыханне
аднаго немаўляці
і мудрасць ссівелага старца.
Я натхненне
соцень імгненняў.
І радасць…
вечная радасць жыцця.

*6 чэрвеня 2018*

* * *

Сэрца тваё,
Знямоглае і абяссіленае,
Упала й разбілася.

Ляцела
Кропелькай бездапаможнаю
У самую бездань.

А трапіла
На далоні Бога.

*15 сакавіка 2018*

* * *

У гэтым свеце попельна-шэрым
Зачыняюцца форткі і дзверы,
І маўклівасці поўняцца меры,
І рыпяць ля пад’езда арэлі.

Тут сядзяць крумкачы на пагостах,
Тут усё трэба толькі па ГОСТах.
Голас звонкі, як рэха, кружляе.
Ён знікае, дзесь заціхае.

Непраходныя снежань, завея —
Лістапад толькі смутак развее.
Разляціцца на друз кволы дом.
Бачу — хтосьці стары за акном...

Пазбіраю з аскепкаў разбітых,
З лепшых песень, на голас забытых,
Той вітраж — атрымаецца новы.
Мы гатовы ажыць, мы гатовы.

*14 верасня 2018*

## МАРСКОЕ ДНО

А часам адчуванне такое — бы я тану.
Ды што там тану — проста іду па дну.
У віры паўпустых падзей і бязважкіх ідэй
Я толькі аскепак калісьці шчаслівых людзей.

І на гэтым дне пасярод празрыстых глыбінь
Адчуваю, што, плач, не плач, ды я ж не адзін!
Такія зоры марскія бываюць адно на дне,
Іх дзівосы раней мог убачыць хіба ў сне.

Я на дне. Ды аднекуль бяру кісларод.
Я амаль што князь. Побач мой плывучы народ.
Побач бель і чырвань мільёнаў каралавых рук.
Марскія конікі граюць — гэта найлепшы гук.

Бляск пяску, зграбнасць водарасцяў-прынцэс,
Дно віруе, жыве — і я бачу гэты працэс.
Дзякуй за карнавал і за свет хараства нематы.
Прачынацца пара. Бо мяне зачакалася ты.

*23 сакавіка 2018*